семестра (заняткі, акадэмічны экзамен, тэхнічны залік), і балаў, атрыманых на выніковым рубежным кантролі (экзамене). Максімальная колькасць балаў можа скласці 100 (з улікам прэміяльных балаў – больш за 100).

Вопыт выкарыстання рэйтынгавай сістэмы ў вышэйшых навучальных установах сведчыць аб павышэнні эфектыўнасці работы студэнтаў на працягу семестра. Гэтая сістэма стымулюе іх вучэбна-пазнавальную дзейнасць, дазваляе рэалізаваць прынцыпы аб'ектыўнасці, сістэматычнасці, галоснасці падчас ацэнкі вынікаў вучэбнай работы.

*А.І.Дубавец*

## РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА АЦЭНКІ ВЕДАЎ ПА ДЫРЫЖЫРАВАННІ

Апошнім часам усё больш студэнтаў не жадаюць быць пасіўнымі аб'ектамі выкладчыцкага ўздзеяння, а шукаюць альтэрнатывы ў навучанні. Новая грамадская роля маладога чалавека, які пастаўлены перад выбарам у палітычным жыцці, духоўным асэнсаванні навакольнага свету, патрабуе ад яго разнапланавасці і самастойнай арыентацыі ў жыццёвых каштоўнасцях.

Складаецца новая канцэпцыя характару самой адукацыі. На змену прынцыпу “вучыць” прыходзіць прынцып “вучыцца”, у якім вялікую ролю адыгрывае самастойная праца студэнта.

Мэта вучэбнага працэсу заключаецца не толькі ў перадачы ведаў ад выкладчыка да студэнта, але і ва ўсебаковым развіцці ў студэнтаў здольнасці да бесперапыннай самаадукацыі, да творчага ўвасаблення ведаў на практыцы. Студэнт павінен быць актыўнай фігурай навучальнага працэсу, а не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасіўным аб'ектам навучання. Вельмі важным сродкам у дасягненні гэтай мэты з'яўляюцца, па-першае, рэгулярная праца студэнтаў, па-другое, сістэматычны кантроль за атрыманнем ведаў.

Увядзенне рэйтынгавай сістэмы дапаможа стымуляваць навучальна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў, павысіць якасць ведаў і прафесійнай падрыхтоўкі. Студэнт павінен ведаць, як і па якіх крытэрыях яго атэстоўваюць. Механізм атэставання працы просты: за канкрэтна выкананую ці прадэманстраваную работу ён атрымлівае ацэнку, выражаную ў балах. Рэйтынгавая сістэма прадугледжвае вызначэнне ўдзельнай вагі кожнага віду студэнцкай працы. Наладжваецца партнёрскае супрацоўніцтва паміж выкладчыкам і студэнтам. Гэта садзейнічае ліквідацыі праяўлення суб'ектывізму, псіхалагічнага дыскамфорту, гарманізуе адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам.

У пачатку семестра неабходна пазнаёміць студэнта з ацэначнай шкалой, правіламі вызначэння яго рэйтынгу; сістэмай кампенсацыі прапушчаных заняткаў, формамі бягучага і выніковага кантролю. Усё гэта павінна быць распрацавана і зацверджана на кафедры.

Навучанне дырыжыраванню мае строга індывідуальны характар, студэнту выстаўляецца агульная ацэнка за пэўны перыяд заняткаў. Веды, атрыманыя па дырыжыраванні, маюць практычны характар, яны залежаць ад методыкі выкладання канкрэтнага выкладчыка і могуць быць выяўлены толькі праз уменні і навыкі, прадэманстраваныя на кантрольных занятках (залік, кантрольны ўрок, экзамен і інш.)

Навучальны год мае два семестры, кожны з якіх вызначае кола патрабаванняў да ведаў, уменняў і навыкаў. Ацэньваюцца яны з улікам бягучых ацэнак, ацэнак на кантрольных уроках, вынікаў самастойнай работы, што з'яўляецца падставай для допуску да экзаменаў і залікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнае значэнне ў стымуляванні самастойнай вучэбнай і вучэбна-даследчай работы студэнта мае паэтапная ацэнка ведаў. Можна ўвесці больш высокую ацэнку за выкананне творчага задання, за работу, якая выходзіць за межы праграмных патрабаванняў, што будзе стымуляваць больш інтэнсіўную работу студэнтаў.

Навучальны працэс па дырыжыраванні і сістэму кантролю за работай студэнтаў можна падзяліць на чатыры модулі. Модуль – гэта мэтавы функцыянальны вузел, у які аб'яднаны навучальны змест і тэхналогія авалодання ім. Модульная тэхналогія дазваляе адаптаваць навучальны працэс да індывідуальных здольнасцей студэнта.

Модульная пабудова структуры курса па дырыжыраванні складаецца з агульнадыдактычнай мэты (выхаванне эстэтычна развітога музыканта, падрыхтаванага да здзяйснення вакальна-харавой дзейнасці, працы з калектывам), таксама з дыдактычных мэт вучэбных модуляў. Усе чатыры модулі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, кожны наступны модуль з'яўляецца лагічным працягам папярэдняга.

*Першы модуль "Асновы тэхнікі дырыжыравання":*

– паняцце аб тэхніцы дырыжыравання і пастаноўцы дырыжорскага апарату;

– асновы метрычнай сістэмы тактавання;

– асваенне простых і складаных сетак;

– віды аўфтактаў;

– асваенне несіметрычных і пераменных памераў;

– сродкі выразнасці ў дырыжыраванні.

Гэты модуль вывучаецца на працягу ўсяго перыяду навучання, у выніку студэнт павінен ведаць:

– гістарычна складзеную мову жэстаў;

– асновы дырыжорскай тэхнікі, прынцыпы і характар рухаў дырыжора;

– спецыфіку харавога дырыжыравання як выканаўчага мастацтва;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– мэту і асноўныя задачы курса “Дырыжыраванне”;

– асноўныя прынцыпы пастаноўкі дырыжорскага апарату;

– тэхналогію свядомага і рацыянальнага кіравання сваімі дзеяннямі:

– заканамернасці перадачы прасторава-рухальнымі знакамі інфармацыі пра гук;

– асноўныя сродкі выразнасці ў дырыжыраванні;

– ролю кісці, прадплечча, локця, усёй рукі дырыжора ў стварэнні штрыхоў;

– мэту выканання дырыжорскіх практыкаванняў.

Студэнты павінны ўмець:

– вызначаць дырыжорскія задачы;

– тактаваць асноўныя дырыжорскія схемы, дырыжыраваць творы рознай ступені складанасці;

– паказваць прыёмы ўступу і зняцця гучання ў жэсце;

– дырыжыраваць выразна з дыферэнцыяцыяй левай і правай рукі;

– дырыжыраваць у розных тэмпах і дынаміцы, паказваць розную фразіроўку ў творах;

– адлюстроўваць у жэсце рытмічныя асаблівасці музычнага твора;

– увасабляць музычны вобраз сродкамі дырыжыравання, творча інтэрпрэтаваць харавую музыку.

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца найбольш дзейснай формай выпрацоўкі ўменняў і навыкаў. Яна прадугледжвае:

– адпрацоўку дырыжорскіх навыкаў з выкарыстаннем комплексу практыкаванняў перад люстэркам;

– выкарыстанне самаацэнкі і самааналізу сваіх дырыжорскіх дзеянняў у дамашняй працы;

– самастойнае вызначэнне дырыжорскіх задач і выбар розных прыёмаў дырыжорскай тэхнікі на аснове выканаўчага плана музыкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– самастойны разбор і падрыхтоўку твора (народнай песні) для працы на занятках у харавым класе.

*Другі модуль "Работа дырыжора над харавой партытурай":*

– змест дырыжорскай падрыхтоўкі;

– падрыхтоўчая работа дырыжора над партытурай;

– вызначэнне дырыжорскіх прыёмаў для выразнага выканання твора;

– асаблівасці вывучэння харавых твораў буйной формы.

Гэты модуль выкарыстоўваецца на працягу ўсяго курса вывучэння прадмета "Дырыжыраванне". Студэнты павінны ведаць :

– асноўныя музычна-выразныя сродкі, заканамернасці і асаблівасці харавога мастацтва (харавыя сродкі выразнасці, тэхнічныя магчымасці хору);

– тыпы і віды харавых партытур;

– сістэму адбору дырыжорсіх жэстаў для выразнага выканання, выразныя магчымасці дырыжорскага жэста;

– асноўныя этапы працы над харавой партытурай.

Студэнты павінны засвоіць наступныя паняцці:

– харавы жанр, від і тып хору, харавая партытура, мелодыя, агогіка, фразіроўка, музычна-слыхавыя ўяўленні, голасавядзенне, змест твора, партытурны запіс.

Студэнты павінны ўмець рабіць разбор партытуры за інструментам, пець галасы харавых партый і акорды партытуры, іграць партытуру на інструменце і на памяць, выпрацоўваць унутраныя музычна-слыхавыя уяўленні.

*Трэці модуль "Аналіз харавых твораў":*

– гісторыка-стылістычны аналіз музыкі;

– музычна-тэарэтычны аналіз твора;

– вакальна-харавы аналіз твора;

– выканаўчы аналіз.

Гэты комплекс тэм таксама вывучаецца на працягу засваення матэрыялу ўсяго курса.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты павінны зразумець ролю і значнасць харавога жанру ў творчасці кампазітара і задачы аналізу харавых твораў. Яны павінны ведаць асаблівасці мастацкага стылю, асноўныя музычныя формы харавых твораў, асноўныя вакальна-харавыя складанасці выканання, тыповыя рысы харавога пісьма кампазітара, тэрміналогію, звязаную з аналізам партытуры, прыкладную схему анатацыі народнай песні.

Студэнты павінны ведаць і тлумачыць сутнасць гісторыка-стылістычнага, музычна-тэарэтычнага, вакальна-харавога і выканаўчага аналізу; разумець наступныя паняцці: выканаўчы план, кульмінацыя, ладатанальны план, мастацкі стыль, арфаэпія, транскрыпцыя, фактура, пераказ, музычнае мысленне, жанр твора, музычныя жанры, метады даследавання.

Навучэнцам трэба ўмець:

– праяўляць музычную адукаванасць пры аналізе музыкі;

– расшыфроўваць аўтарскія ўказанні, аналізаваць творчасць кампазітара і паэта, разбірацца ў жанрах народнай песні і яе стылістычных асаблівасцях;

– арганізаваць работу з самадзейным харавым калектывам;

– працаваць з метадычнымі дапаможнікамі і падручнікамі.

*Чацвёрты модуль "Падрыхтоўка да прафесійнай дзейнасці кіраўніка самадзейнага харавога калектыву" ўключае:*

– падрыхтоўку да дырыжорскай практыкі ў самадзейным калектыве;

– развучванне твора для практыкі на ўроку;

– практычную работу з самадзейным хорам;

– развіццё прафесійнага мыслення дырыжора.

Комплекс гэтых пытанняў вывучаецца на 3-м і 4-м курсах. Студэнты павінны ведаць:

– метады і прыёмы вакальна-харавой работы;

– асноўныя элементы развучвання песні;

– прынцыпы падбору рэпертуару для народнага хору;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– план развучвання песні;

– план рэпетыцыйнай работы з харавым калектывам.

Навучэнцы павінны ўмець праводзіць распяванне хору, праяўляць самастойнасць і актыўнасць мыслення пры інтэрпрэтацыі харавых твораў, мець пачуццё прафесійнай свабоды ў кіраванні калектывам.

Дырыжыраванне – урок комплексны, ён канцэнтруе некалькі відаў музычнай дзейнасці: выканаўчы (дырыжыраванне, вакал, ігра на інструменце); аналітычны (уменне аналізаваць партытуру, узровень яе ўспрымання); практычны (методыка працы над творам, прыёмы паказу галасам, на інструменце, здольнасць правільна сфармуляваць думку); метадычны.

Рашаючую ролю ў засваенні метадаў і набыцці ўменняў і навыкаў адыгрывае самастойная дамашняя работа. У працэсе яе фарміруецца перадрэпетыцыйная тэхніка хормайстра, якая ў будучай самастойнай дзейнасці стане падмуркам беспераПыннага прафесійнага росту.

*В.Е.Лявончыкаў*

## УКАРАНЕННЕ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ КАНТРОЛЮ ЗА ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ СТУДЭНТАЎ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Укараненне рэйтынгавай сістэмы кантролю за вучэбнай дзейнасцю студэнтаў на кафедрах факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый абумоўлена як знешнімі, так і ўнутранымі прычынамі. Беларусь далучылася да Балонскай канферэнцыі ў галіне адукацыі еўрапейскіх краін, у большасці з якіх ужо даўно выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя тэхналогіі атэстацыі студэнтаў. Па гэтай прычыне ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь пачалі распрацоўвацца тэарэ-